468
469

# СТРАЯВЫ ВАЙСКОВЫ СТАТУТ

МЕНСК — 1943

Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

470

# СТРАЯВЫ ВАЙСКОВЫ СТАТУТ

Пераапрацаваў
з нямецкага вайсковага статуту
*(Ausbildungsvorschrift für die Infanterie Heft 2-a)*
падпаручык арт. *Мікула Віталі*

МЕНСК — 1943

Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

Schul- und Jugendverlag in Minsk
Выдавецтва Школьных Падручнікаў і Літаратуры для Моладзі у Менску.

Druck: Minsker Verlags- und Druckerei GmbH, Minsk
Друкарня: Менскае Выдавецкае і друкарскае т-ва з абм. адк. Менск.

Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

471

468б

*З днём выданьня Беларускага Вайсковага Статуту становіцца ён абавязкавым для Б. С. А. на усім абшары Беларусі. Адначасна можа быць выкарыстаны у радах беларускай паліцыі, у школах і іншых арганізацыях пры фізычна-ўзгадаваўчых занятках.*

*Галоўны Кіраўнік Б. Н. С.*

*(—) Д-р. Ермачэнка.*

---



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

472
468в

## ПРАДМОВА.

Беларускае выданьне «Вайсковага Страявога Статуту» не зьяўляецца літаральным перакладам «Ausbildungsvorschrift für die Infanterie». Некаторыя паняцьці або формы нямецкі статут паясьняе вельмі лякванічна, што трэба было для менш выработаных вайскова беларусаў пашырыць. «Вайсковы Страявы Статут» ёсьць першай беларускай вайсковай інструкцыяй і таму некаторыя паняцьці, паданыя тут, а не прадугледжаныя нямецкім статутам пяхоты, зьяўляюцца неабходнымі для першапачатковай вайсковай падрыхтоўкі (1 частка статуту).

Усе каманды і тэрміны узараваныя на нямецкім строі і апрацаваныя на Беларускіх Перападрыхтоўчых Афіцэрскіх Курсах у Менску.

Калі хто з Паважаных Чытачоў зможа замяніць некаторыя пададзеныя тут каманды або акрасьленьні на лепшыя, прашу надаслаць свае праекты у Цэнтралю БНС—(Вайсковы рэфэрат) у Менску. Пры другім выданьні статуту ўсе прысланыя заўвагі будуць выкарыстаныя.

Пры апрацоўцы «Вайсковага Страявога Статуту» найбольш працы улажыў падпаручык арт. Мікула Віталі і таму ўважаецца ён за аўтара гэтай працы.

(—) КУШЭЛЬ, Капітан

Камандзір Беларускага Перападрыхтоўчага Афіцэрскага Курсу



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

473

*I ЧАСТКА*

## АГУЛЬНЫЯ АЗНАЧЭНЬНІ.

1. **Строй**—дакладна вызначаны статутам парадак стральцоў і падразьдзелаў для іхнага супольнага разьмяшчэньня, руху і дзеяньняў.

2. **Шэраг**—стральцы стаяць адзін каля аднаго на аднэй лініі.

3. **Трохшэрагавы строй**—тры шэрагі стаяць на 80 см. узаплеч адзін за адным. Шэрагі называюцца першым, другім і трэцім. Пры паваротах строю назовы шэрагаў ня зьменьваюцца.

Да дзесяці чалавек строяцца у вадзін шэраг.

4. **Рад**—стральцы стаяць узаплеч адзін аднаму на 80 см.

Калі ў строю за стральцом першага шэрагу не стаіць стралец узаплеч у другім ці трэцім шэрагу, дык такі рад называецца няпоўным.

Калі выступіць стралец з першага шэрагу, дык ягонае месца займае заплечнік. Пры зьмене фронту ў тыл стралец (камандзір) няпоўнага раду пераходзіць у франтовы шэраг.

5. **Флангі**—Правы канец строю называецца правым флангам, левы—левым. Пры паваротах строю назовы флангаў ня зьменьваюцца.

6. **Фронт**—кірунак строю, куды стральцы павернуты тварам, правы фланг—з правага боку, а левы—з левага.

7. **Шырыня фронту**—адлегласьць паміж флангамі строю.

8. **Глыбіня строю**—адлегласьць ад першага шэрагу (стральца) да апошняга шэрагу (стральца).

9. **Водступ**—адлегласьць паміж пададдзеламі, (стральцамі) у глыбіню, ад задняга шэрагу (стральца) пярэдняга пададдзелу да першага шэрагу (стральца) задняга пададдзелу.

10. **Прамежак**—адлегласьць паміж суседнімі аддзеламі, пададдзеламі і стральцамі ўздоўж фронту.

11. **Калёна**—строй, глыбіня якога большая за ягоную шырыню, або аднолькава з ёю.

12. **Галава калёны**—пярэдняя частка калёны. **Хвост**—**задняя** частка калёны.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

13. **Разгорнуты строй**—пададдзелы разьмешчаны на аднэй лініі ў фроньце (у двух, трох шэрагах або калёнах) на прамежках, вызначаных статутам.

14. **Кірунковы—**стралец або пададдзел, што ідзе першым у вызначаным кірунку; усе іншыя стральцы або пададдзелы ідуць за кірунковым.

Строй кіруецца праз каманды і загады, якія падаюцца голасам, сыгналамі, умоўнымі знакамі ды асабістым прыкладам. Для кіраваньня строем камандзір знаходзіцца там, адкуль яму зручней камандаваць і дзе яго могуць бачыць і чуць усе стральцы. Каманды падзяляюцца на падрыхтоўную і выканаўную. Побач з гэтым ёсьць каманды, якія азначаюць толькі выкананьне: «устаць», «зважай» і г. д. Падрыхтоўная каманда аддаецца выразна, голасна і працяжна, так каб тыя, што стаяць у строю, зразумелі чаго патрабуе камандзір. Выканаўная каманда аддаецца пасьля кароткай паўзы за падрыхтоўнай голасна, адрывіста і энэргічна.

15. **Загад**—ёсьць выражэньне волі камандзіра вусна, пісьмова або умоўным знакам. Загад павінен быць заўсёды выкананы дакладна.

16. **Каманда**—вуснае выражэньне волі камандзіра. Каманда выконваецца зараз-жа пасьля яе аддан ьня і адначасна, калі яна скіравана да групы стральцоў.

## *II ЧАСТКА*

## АДЗІНОЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА.

### I. АСНОЎНАЯ ПАСТАВА.

1. Вонкавы выгляд стральца зьяўляецца паказчыкам яго фізычнага і маральнага ўзгадаваньня.

2. Асноўная пастава бяз стрэльбы. **«ЗВАЖАЙ!».**

Пры асноўнай паставе стаіцца ціха, пяты злучаныя разам, наскі разсунуты прыблізна на даўжыню стапы так, каб не утваралі простага кута. Цяжар цела спачывае раўнамерна на абодвых стапах. Калені злучаныя і крыху паданыя ўзад. Тулава выпраставанае, грудзі лёгка выпнутыя, жывот уцягнены, плячукі вольна апушчаныя і на аднолькавай вышыні. Лапаткі сьцягнены, локці падданыя крыху наперад, рукі прыложаны да сьцёгнаў, пальцы злучаныя. Палец сярэдні спачывае на шве нагавіц. Вялікі палец прыцісьнены да далоні ўздоўж паказальнага. Галава прыўзнятая, барада прыцягнена крыху да шыі. Позірк скіраваны насупроць. Цягліцы крыху і раўнамерна напятыя. Лішняя натуга цягліц вядзе к вымушанай і ненатуральнай паставе.

474

3. **Асноўная пастава са стрэльбай.**

Стаіцца, як у § 2. Стрэльба з правага боку, каблуком уперад і прастападла да зямлі. Прыклад каля правай нагі, канец на вышыні наска бота. Правая рука абнімае стрэльбу на вышыні, на якую пазваляе асноўная пастава. Вялікі палец на накладцы, рэшта пальцаў злучаныя і пахіленыя наўскасяк. Локці на аднолькавай вышыні.

4. На каманду **«УВАГА!»** або папярэджальную каманду прымаецца таксама асноўную паставу.

5. **«ВОЛЬНА!»** левая нага высоўваецца наперад. Можна парушацца, аднак без спэцыяльнага дазволу гутарка забаронена.

II. 1. УХВАТЫ (агульна).

Пры ухватах зброяй працуюць толькі рукі. Цела астаецца нярухомым. Паасобныя рухі выконваюцца коратка і бадзёра. Забараняецца стукаць прыкладам моцна аб зямлю.

2. УХВАТЫ СА ЗДОЎЖАНЫМ ПАСАМ. **«ЗБРОЮ НА ПАС!».**

Правая рука пераносіць стрэльбу перад цела, прастападла да зямлі. Руля ад сябе. Адначасна левая рука абнімае стрэльбу над правай так, каб верхняя рэхва была на вышыні вачэй. Правай рукой бяром за пас (пры гэтым вялікі палец выпраставаны пад пасам) і прыцягаем яго бадзёра да грудзей. Левая рука кідае стрэльбу за правае плячо. Стрэльба вісіць прастападла. Правы кулак на вышыні грудзей. Правы локаць прыцісьнены да тулава. Левая рука ідзе непасрэдна да асноўнай паставы.

3. **«ЗБРОЮ ЗЬНЯЦЬ!».**

Правая рука перакідае стрэльбу перад сябе. Адначасна левая хапае яе над цэльнікам. Верхняя рэхва на вышыні вачэй. Правая рука, ухапіўшы стрэльбу над левай, пераносіць яе кругом цела управа, абарочваючы крыху ў тым-жа напрамку. Левая рука апускаецца адначасна да асноўнай паставы. Локаць правай рукі прыцісьнены да боку. Стрэльбу стаўляем пры назе, як у § 3/1.

4. Калі пас падоўжаны, стрэльбу можна перавесіць праз плечы, узяць на правае плячо, або завесіць на шыі.

5. **«ЗБРОЯ НА ШЫЮ!».** Правая рука пераносіць стрэльбу перад сябе (пас з левага боку). Левая рука хапае за пас. Абедзьвімі рукамі закладаем стрэльбу на шыю.

6. **«ЗБРОЮ ЗА ПЛЕЧЫ!».** Закладаем зброю на шыю, як у § 5, правую руку укладаем між пасам і стрэльбаю.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

Ухапіўшы правай рукой за прыклад, перасоўваем стрэльбу ў найвыгаднейшае палажэньне.

Самакатчыкі і коньнікі вешаюць стрэльбу праз правае плячо.

Зброю здымаецца на загад «Зброю зьняць!».

## II. МАРШ.

1. Разрозьніваецца марш свабодным крокам, роўным крокам і вучэбным крокам.

2. **«СВАБОДНЫМ КРОКАМ—МАРШ!».** Выступаецца левай нагой. Даўжыня і хуткасьць кроку залежыць ад мясцовасьці і фізычнай будовы стральца. Пры гэтым захоўваецца правільная пастава.

3. **«РОЎНЫМ КРОКАМ—МАРШ!».** Усе стральцы выступаюць адначасна левай нагой. Даўжыня кроку—80 см. Хуткасьць—114 крокаў на хвіліну. Пастава выпраставаная. Галава прыўзьнятая.

4. Вучэбны марш вымагае некаторай натугі сіл. Ён зьяўляецца паказчыкам стралецкае энэргіі і ягонай вайсковай падрыхтоўкі. Вонкава прадстаўляе стральцоў, як адзіную цэласьць. Вучэбны крок ужываецца пры выконваньні сталай службы вартаўніка і пры аддаваньні пашан старэйшым, як адзіночна, так і групова.

На каманду **«АДДЗЕЛ КРОКАМ—МАРШ!»** левую ногу выкідаем уперад. Стапа выпраставаная, пальцы накіраваны крыху ў бок. Калена выпраставанае. Нага выцягненая на 80 см. Правая нага паўтарае дзейнасьць левай. Хуткасьць крокаў—114 на хвіліну. Пры гэтым калена не падымаць вышэй, як вымагае гэтага даўжыня кроку. Занадта моцнае апусканьне нагі на зямлю—непажаданае. Галава і верхняя частка цела—у асноўнай паставе. Кроку вучэбнага вучыцца стралец пасьля вышкаленьня яго роўным крокам.

Пераход вучэбнага або свабоднага кроку ў роўны робіцца на каманду «Роўны крок!». Вучэбны марш, пры пераходзе з другога, выконваецца па камандзе **«ЗВАЖАЙ!».**

5. **«АДДЗЕЛ—СТОЙ!»** Пасьля каманды «Стой!» стралец робіць яшчэ адзін крок і заднюю ногу дастаўляе хутка да пярэдняй. Пры вучэбным або роўным крокам маршах—каманда «Стой!» падаецца тады, калі ставяць правую ногу.

6. Пры маршы са стрэльбай, рука, якая трымае стрэльбу, нярухомая. Другая рука рухаецца ў такт маршу. Пальцы крыху сагнуты.

## III. ЗВАРОТЫ (на месцы).

1. Павароты робяцца хутка. Выконваюцца толькі з асноўнай паставы. Пасьля павароту абавязвае асноўная па-



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

става. Калі стрэльба зьнята, трэба яе у часе звароту мацней трымаць, прыціскаючы адначасна да боку. У часе звароту стрэльба захоўвае сваё палажэньне, суадносна усяго корпусу, нязьменна.

2. **«У ЛЕВА—ФРОНТ!».** Пальцы левае нагі і пята правае падымаюцца; зварот робіцца на левай назе, правай нагой адбіваемся і робім зварот на 90° улева. Зрабіўшы зварот, прыстаўляем хутка правую нагу да левай.

3. **УПРАВА—ФРОНТ!».** Левая пята, на якую пераносіцца цяжар цела, застаецца на месцы. Левыя пальцы крыху паднятыя; правы абцас падымаецца ад зямлі. Стралец адпіхаецца правымі пальцамі направа, пасьля, зрабіўшы зварот на 90°, прыстаўляе хутка правую нагу да левай.

4. **«У ТЫЛ—ФРОНТ!».** Зварот робіцца на 180° улева, як у § 2/III.

## ЗВАРОТЫ Ў МАРШЫ.

5. **«УЛЕВА (УПРАВА) ФРОНТ!».** Канец каманды павінен падавацца ў часе маршу роўным крокам пад правую ногу; калі робіцца зварот управа, і пад левую ногу—калі робіцца зварот улева. Другой нагою робіцца адзін крок уперад, пасьля выконваецца зварот на яе пальцах, выстаўляецца уперад правая нага, калі направа, і левая нага—калі зварот налева, і маршыруецца у новым напрамку далей.

6. Перад падачай каманды **«У ТЫЛ—ФРОНТ!»,** трэба аддзел затрымаць.

7. Звароты ў маршы вучэбным крокам выконваюцца толькі пры аркестры.

8. **«ЛЯГАЙ!»** Стралец робіць крок левай нагой, пахіляючы корпус уперад, становіцца на правае калена, абхапляючы адначасна леваю рукою стрэльбу ў сярэдзіне яе цяжару. Пасьля, пахіляючы корпус уперад, выпростоўвае правую руку далоньню уніз і кладзецца на зямлю, апіраючыся перш на левае калена, пасьля на правую далонь і у канцы—на левы локаць. Усе гэтыя чарговыя рухі робяцца хутка адзін за другім. Стралец ляжыць проста, ня згінаючыся ў клубох, пяты бяз прымусу ляжаць блізка зямлі. Стрэльба абапёртая на левым прадплеччы пад верхняй рэхвай. Галка замка ўгары. Правая рука трымае стрэльбу пад замком. Галава крыху прыўзьнятая, вочы глядзяць уперад.

9. **«УСТАЦЬ!».** Леваю рукою бярэцца стрэльбу ў пункце цяжару. Правую руку падкладаецца пад грудзі далоньню уніз, прыцягваецца правую ногу як найбліжэй да цела, не падымаючы пры гэтым корпусу. Тады энэргічна адпіхаецца



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

праваю рукою ад зямлі і хутка устаецца, выстаўляючы левую нагу ўперад і прыстаўляецца да яе правую. Адначасна праваю рукою бярэцца стрэльбу і прыстаўляецца яе да правага боку. Стралец стаіць на «вольна».

## IV. НАБІВАНЬНЕ І ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЕ. ВЫБІВАНЬНЕ.

1. Набіваецца зброя пры ўсякім палажэньні цела. У руху, а гэтак сама і ўначы. Лежачы набіваецца ў большасьці у раскідным строі. Выйманьне набояў толькі стоячы. Стралец павінен набіваць сваю стрэльбу вельмі хутка і спрытна, каб вораг не сумеў уцячы або папярэдзіць яго стрэл.

2. Па камандзе **«ЗБРОЮ НАБІВАЙ!»** стралец, не прымаючы асноўнай паставы, адчыняе леваю рукою набойніцу; пасьля праваю рукою пераносіць стрэльбу сукосна перад грудзьмі і бярэ яе ніжэй цэльніка левай рукой. Вылёт рулі высока ўлева. Вялікі і паказуючы пальцы правае рукі бяруць за галку, пры гэтым другі сустаў вялікага пальца ляжыць на ручцы, паварочваюць замок улева і адцягваюць яго узад. Цяпер правая рука, паміж стрэльбай і целам, бярэ з набойніцы вялікім і паказуючым пальцамі абойму з набоямі, адхіляючы яе крыху узад, і ўкладвае яе у выраз абыймы. Чатыры пальцы правае рукі кладзецца на вечку, а вялікім пальцам моцна націскаюць на набой каля абоймы датуль, пакуль ён ня войдзе ў прыладу падавальніка. Вялікім пальцам націснуць набой уперад і ўзад, каб праканацца ці ён ляжыць роўна на падавальніку. Пасьля вялікі і паказуючы пальцы правае рукі бяруць за галку як пры адчыненьні, пасоўваюць замок уперад і паварочваюць яго управа. Абапёршы прыклад аб прадплечча, (руля скіраваная ўверх) вялікім і паказуючым пальцамі хапаем за галоўку бясьпечніка, адцягваем яго ўзад і перакручваем улева. Стрэльба набітая і забясьпечаная. Цяпер пераносіцца яе ў ранейшае палажэньне. Леваю рукою зашпіліць набойніцу. На лініі стрэльбы не забясьпечваецца.

3. **«ВЫБІВАЙ!»**. Левая рука адчыняе набойніцу, пасьля бярэ перанесеную сукосна перад грудзьмі стрэльбу так, каб вялікі палец ляжаў з левага, а чатыры пальцы з правага боку замка, уставіўшы стрэльбу аб правае прадплечча як пры забясьпячэньні вялікі і паказуючы пальцы адбясьпечваюць стрэльбу, бяруць галку і, павярнуўшы яе ўлева, адцягваюць замок назад. Тыя-ж пальцы бяруць выцягнуты набой і кладуць у набойніцу. Пасоўваючы замок узад і ўперад, вымаюцца ўсе набоі. Вынуўшы набоі, стрэльбу бярэцца за шыйку, паказуючы палец сьцягвае спуск, левая далонь зачыняе адначасна замок. Стрэльба ставіцца ў асноўную паставу. Левая рука зачыняе набойніцу. Калі час пазваляе, набоі залажыць у абойму.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

476

## V. НАСТАЎЛЕНЬНЕ ЦЭЛЬНІКА.

На каманду **«ЦЭЛЬНІК Х!»** стралец падае стрэльбу узад, лёгка паднімаючы да твару. Вялікі і паказуючы пальцы правае рукі хапаюць хамуцік цэльніка і перасоўваюць яго на паданы лік, пасьля чаго стрэльба ставіцца у ранейшае палажэньне, галава выпрастоўваецца, а вочы глядзяць у паказаным кірунку.

## VI. НАСАДЖВАНЬНЕ І ЗЬНІМАНЬНЕ ШТЫХА.

1. Насаджваць штых на стрэльбу можна пры усялякіх яе палажэньнях, а таксама і ў часе руху, заўсёды у паставе «Вольна» па камандзе або сыгналу.

2. У паставе стаячай на каманду **«ШТЫХ НАДЗЕНЬ!»** стралец ставіць стрэльбу простападла і процiў сярэдзіны цела, ухватваючы яе левай рукой паміж верхняю і ніжняю рэхвай. Праваю рукою насаджвае штых.

3. **«ШТЫХ ЗЬНЯЦЬ!»** спаўняецца на месцы у паставе «Вольна». Паставіўшы стрэльбу простападла процiў сярэдзіны цела, праваю рукою зьнімаецца штых і хаваецца ў похаў.

## VII. АДДАВАНЬНЕ ПАШАНЫ.

1. Для зазначэньня стралецкай карнасьці і прыналежнасьці да аднэй сям'і, кожны стралец павінен аддаваць пашану старэйшым. Аддаваньне пашаны павінна быць хуткае і бадзёрае.

2. **Аддаваньне пашаны бяз зброі на месцы.** Стралец пры зьліжэньні старшэйшага і калі ён без галаўнога ўбору прымае асноўную паставу, фронтам да падходзячага. Калі-ж з галаўным уборам—прымае асноўную паставу і адначасна правую руку падносіць направа ускос да галаўнога убору. Пальцы датыкаюць шапку на лініі вачэй. Далонь скіраваная уніз. У часе пераходу старшэйшага прывітаньне пачынаецца 6 крокаў перад і два крокі за стральцом. Пры мэльдунку рука астаецца пры шапцы прыблізна адну сэкунду. Аддаўшы прывітаньне, правая рука адыходзіць бадзёра на месца.

3. **Аддаваньне пашаны бяз зброі у руху.** Прывітаньне пачынаецца 6 крокаў перад старшэйшым і 2 крокі за. Без галаўнога ўбору стралец маршыруе вучэбным крокам, галаву паварочваецца бадзёра да старшэйшага. Позірк скіраваны ў тым-жа напрамку. З галаўным уборам маршыруецца вучэбным крокам. 6 крокаў перад старшэйшым прыкладаецца руку да шапкі з аднaчасным зваротам галавы, як вышэй. Два крокі за старшэйшым рука апускаецца на месца з аднaчасным зваротам галавы перад сябе. У часе аддаваньня пашаны левая рука нерухомая.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

И765

## III ЧАСТКА

# I. ДРУЖЫНА

1. Дружына складаецца з камандзіра дружыны і 9-ці стральцоў.
2. Дружына мае ручны кулямёт і групу стральцоў.
3. Рыштунак.

| ФУНКЦЫЯ | РЫШТУНАК | ЗАДАНЬНЕ |
|---|---|---|
| К-р дружыны | I. Стрэльба і 30 набояў<br>2. 2 набойніцы для набояў<br>3. Компас.<br>4. Сьвісток.<br>5. Электрычны ліхтарык<br>6. Малая рыдлёўка<br>7. Супроцьгазавая маска | Камандзір дружыны вядзе у бой сваю дружыну, кіруе агнём ручнога кулямёту і стральцоў. Першым ідзе у атаку, вядучы за сабой усю дружыну. Ён адказвае за цэласьць рыштунку дружыны. |
| Цэляўнічы. | I. Ручны кулямёт.<br>2. Магазын з набоямі<br>3. Палявая рыдлёўка<br>4. Супроцьгазавая маска | У часе маршу носіць кулямёт, падчас бою вядзе агонь. |
| Два амуніцыйныя. | Кожны мае:<br>I. 4 магазыны набояў<br>2. Стрэльбу<br>3. Палявую рыдлёўку<br>4. 2 ручныя гранаты<br>5. Супроцьгазавую маску. | Носяць амуніцыю і падаюць цэляўнічаму, трымаюць лучнасьць з патроннай двухколкай.<br>Пустыя магазыны адносяць на амуніцыйную двухколку, бяручы там поўныя. У разлучным строі знаходзяцца з правага і левага боку блізка ад цэляўнічага, падаюць яму магазыны з набоямі і маюць заўсёды пры сабе іх запас.<br>Калі цэляўнічы выбудзе, яны мусяць яго заступіць. |
| 5 стральцоў. | Кожны мае:<br>1. Стрэльбу<br>2. 30 набояў.<br>3. 4 ручныя гранаты<br>4. Палявую рыдлёўку<br>5. Супроцьгазавую маску | У часе бою вядуць агонь, змагаюцца гранатаю і штыхом. |
| Заступнік кам. дружыны. | Рыштунак такі-ж, як і у стральца. | Замыкае строй дружыны, сочыць за парадкам у дружыне. Калі выбудзе камандзір дружыны,—заступае ягонае месца |



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

477

## II. ЗБОРКІ ДРУЖЫНЫ.

1. Дружына мае злучныя строі: шэраг, маршавая калёна і рад. Для пастраеньня стральцоў аддаюцца каманды:

**а) у шэрагу—зборка!**

**б) у маршавую калёну—зборка!**

**в) у рад—зборка!**

Перад адданьнем асноўнай каманды, камандзір дружыны камандуе **«увага!»** На гэтую каманду ўсе стральцы становяцца фронтам да камандзіра ў паставе **«зважай»**. Камандзір становіцца там, дзе хоча зрабіць зборку і аддае адну з трох камандаў. На каманду **«у шэраг—зборка!»** усе стральцы ідуць прысьпешаным крокам да месца зборкі. Правафлангавы стралец спыняецца на тры крокі перад камандзірам у асноўнай паставе. Усе наступныя стральцы—улева ад яго.

На каманду **«у маршавую калёну—зборка!»** правафлангавы стралец спыняецца на тры крокі перад камандзірам, два наступныя—побач улева ад яго; чацьверты стралец за першым, два наступныя—улева ад яго. Заступнік камандзіра дружыны у апошняй тройцы з левага боку. Усе стральцы бяруць звычайны прамежак, адступ і раўнаюцца.

На каманду **«у рад—зборка!»** першы стралец спыняецца на тры крокі перад камандзірам. Усе іншыя—узаплеч яго. Заступнік камандзіра дружыны—на канцы.

Калі камандзір хоча зборку правесьці як найхутчэй, дык у камандзе перад словам «зборка» дадае **«бягом»**.

Прыняўшы загаданы строй, па кароткім і агульным выраўнаньні, стаіцца ў асноўнай паставе. Прамежкі між стральцамі на шырыню далоні—так, каб локцямі лёгка датыкаць суседа. Водступы у радзе, або маршавай калёне—80 м. Калі ня было асобнага загаду, раўняецца заўсёды ўправа. Раўнаньне тады ёсьць добрым, калі пры добрай асноўнай паставе, павярнуўшы галаву управа, правым бокам бачыць свайго суседа, левым—зарыс цэлай лініі. Па камандзе **«вольна»** раўнаньне і крыцьцё папраўляюцца. Для лепшага выраўнаньня падаецца каманду: **«Зважай—раўнай!»**, або **«зважай—улева раўнай!»**. Для пераходу ў паставу «вольна» падаецца: **«зважай—вольна!»**.

2. **Адлічаньне.** Па камандзе **«чаргова—лічы!»** стральцы прымаюць асноўную паставу і паварочваюць голавы ўправа. Правафлангавы паварочвае энэргічна галаву ўлева і галосна кажа: «Раз». Пасьля зараз-жа становіцца у вольнай паставе. Другі робіць гэтак сама, гаворачы нумар па чарзе і г. д. аж да левафлангавага, які, гледзячы ў кірунку камандзіра, кажа свой нумар. Калі аддзел стаіць у трох шэрагах—заднія шэрагі, не паварочваючы галавы



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

і ня лічачы, становяцца адначасна з папярэднікамі на «вольна».

Акрамя чаргавага лічэньня можна адлічаць да двух, да трох і г. д.

3. Пры падыходзе старшэйшага, камандзір, стаючы перад строем, падае каманду: **«Зважай!»**—пасьля **«направа (налева)—глянь!».** Стральцы зварочваюць адначасна галавы ў напрамку старшэйшага. Камандзір хуткім крокам ідзе да старшэйшага, затрымліваецца тры крокі перад ім, аддае пашану і дакладае: «Другі зьвяз. Прысутных 26 стральцоў». На даны знак старшэйшага—аддае чэсьць, робіць зварот у патрэбным напрамку і згодна загаду старшэйшага камандуе: **«Зважай—вольна!».** Калі другі камандзір хоча пераняць каманду ў свае рукі—камандуе: **«Аддзел слухае** маю каманду».

## III. МАРШ, БЕГ, ЗЬМЕНЫ НАПРАМКУ.

1. Па камандзе **«марш!»** выступаецца левай нагой уперад, як у § III адзіночнае падрыхтоўкі, пры гэтым захоўваецца раўнаньне і крыцьцё.

2. **«Бегам—марш».** Захоўваючы строй, стральцы бягуць з усёй сілы, аж да каманды: «Свабодным крокам!», або «аддзел—стой!».

3. **ПАЛЁГКІ Ў МАРШЫ.** Прымаецца за горадам па камандзе **«вольна!».** Камандзір аддзелу маршыруе ў давольным месцы пры сваёй адзінцы. Калі ня было асобных загадаў, дазваляецца гутарыць, пяяць, курыць, есьці. Стрэльбы можна нясьці на правым або левым плячы, або завесіць на шыю. Пры пераходзе на «вольна» перад стар-

| ЗЬМЕНЫ ФОРМЫ | КАМАНДА | ВЫКАНАНЬНЕ |
|---|---|---|
| З шэрагу у рад | На месцы<br>а) „рад управа, свабодным крокам—марш!"<br>б) „Управа - фронт!"<br>У маршы<br>в) „рад управа—марш"<br>г) „Управа—фронт". | Дружыновы на правым крыле ідзе проста перад сябе. Стральцы робяць зварот управа і устаўляюцца за ім. |
| З маршавай калёны у рад | „Рад управа—марш". | Камандзір дружыны на правым крыле ідзе проста перад сябе. Стральцы робяць зварот управа і устаўляюцца за ім. |
| З раду або маршавай калёны у шэраг. | „Шэраг улева—марш". | Дружыновы або кіруньковы дружыны ідзе наўперад, стральцы заходзяць улева. |



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

шэйшым, камандзір, які ўгледзіць яго першы, падае: **«Увага—камандзір роты зправа!».** Загад перадаецца аддзелам узад. Пры перамаршы—зброя астаецца ў даўнейшым палажэньні, рукі ходзяць да паса. Камандзір данага аддзелу дакладае: «Нясьвіская рота ў маршы на заняткі. Прысутных 9 камандзіраў, 223 стральцоў». Пры пераходзе з маршу на «вольна» падаецца: **«Маршавая калёна!».**

**4. ЗЬМЕНЫ НАПРАМКУ.** Для зьмены напрамку падаецца каманда: «Кірунак улева (управа)!» Галава калёны скарочвае крок. Левафлангавы (правафлангавы) першай тройкі паварочваецца у месцы улева (управа), астатнія стральцы першай тройкі заходзяць улева (управа) аж да каманды **«проста!».** На каманду **«марш!»** здоўжваецца крок і маршыруецца ў новым напрамку.

**5. «ЛЯГАЙ».** Пры маршы радам на каманду **«лягай»** стральцы робяць зварот направа—ускос і кладуцца так, каб пярэдняя частка корпуса была на вышыні ног папярэдніка. У маршавай калёне правы і сярэдні рад зварочваюцца ўправа—ускос, левы рад—улева—ускос і кладуцца, як вышэй; сярэдні рад у прамежках правага раду.

IV. СТРОЙ РАЗЛУЧНЫ ДРУЖЫНЫ.

Калі ўласнае палажэньне, або блізкасьць сутычкі з ворагам не пазваляюць захаваць нам строю злучнага,—прымаем строй раскідны (у зьвязе і вышэй) і разлучны (строй разлучны зьяўляецца другой фазай раздрабленьня аддзелу ў баявых абставінах).

Дружына мае наступныя разлучныя строі: а) шнур стралецкі, б) рад стралецкі. (Рыс. 1.). Рад стралецкі ужываецца пры маршы зблізэньня. Ён спрыяе лепшаму выкарыстаньню поля і ўтрудняе нагляд ворага. У маршы радам стралецкім—дружыновы перад дружынай. На чале раду стралецкага цэляўнічы, далей—першы, другі амуніцыйны; на канцы—заступнік дружыновага. Водступы між стральцамі—5 крокаў. Для магчымасьці адкрыцьця агню, дружына раскідаецца у шнур стралецкі. Перад шнурам, у адлегласьці, залежнай ад поля—дружыновы.

Пасярэдзіне—Р.К.М., управа і улева—стральцы, як на рыс. 2. Прамежкі між стральцамі—5 крокаў.

Трэба памятаць, што даўжэйшы марш шнурам стралецкім утрудняе выкарыстоўваньне поля, вымагае ад стральцоў большай натугі сілы і ўтрудняе камандаваньне дружынай. Таму ўжываць гэты строй толькі ў патрэбных выпадках. У залежнасьці ад поля і баявых умоваў, адступы і прамежкі могуць быць здоўжанымі або скарочанымі. Кірунковым у дружыне зьяўляецца цэляўнічы; ад яго бярэцца водступы і прамежкі. Калі не паданы кірунковаму напрамак маршу—маршыруе ён за дружыновым.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

V. ПРЫКЛАДЫ КАМАНДАЎ І ЗАГАДАЎ:

**1. «КІРУНАК РОГ ЛЕСУ. РАДАМ СТРАЛЕЦКІМ—МАРШ!».**

**2. «КІРУНАК—АДЗІНОЧНАЕ ДРЭВА НА КРУГАЗОРЫ. ПРАМЕЖАК—10 КРОКАЎ. ШНУРАМ, БЕГАМ—МАРШ!».**

**3. «УЗДОЎЖ КУСТОЎ ПЕРАД НАМІ, ВОДСТУП—2 КРОКІ, РАДАМ СТРАЛЕЦКІМ—МАРШ!».**

**4. «ДЛЯ АСЯГНЕНЬНЯ БЛІЖЭЙШАГА ЎЗВЫШША—ДРУЖЫНА НА СТАНОВІШЧА БЯГОМ—МАРШ!».**

Дружыновы не зьвязаны са сталым месцам. Для лепшага нагляду, для выкарыстаньня поля і для сувязі з суседзямі, можа ён аддаліцца ў бакі або ўперад дружыны.




Рыс. 1.




Рыс. 2.




Рыс. 3




Рыс. 4.




Рыс. 5.

Падчас абстрэлу праціўнікам, находзіцца ён пасярэдззіне сваёй дружыны. У канцы дружыны маршыруе заступнік дружыновага, які наглядае, каб ніхто са стральцоў не аставаўся. У разлучным строі зброя зьнятая з пляча і нясецца ў гатовасьці да стрэлу (прыклад пад правай пахай, руля перад сябе і крыху накірованая ўніз). У поблізу праціўніка



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

гутаркі, курэньне і г. д. забароненыя. У лесе, уночы і ў тумане найменшы гоман можа выкрыць ворагу нашую прысутнасьць.

Калі зброя набітая, кожны стралец павінен яе забясьпечыць. Набойніцы ў руху заўсёды зашпіленыя. Загадам да руху аддзелу ёсьць каманда **«марш!», «бягом—марш!»,** або ўмоўны знак. Загадам да руху ў тыл ёсьць каманда: **«У тыл фронт—марш!».** Камандзір знаходзіцца заўсёды ад боку праціўніка. Затрыманьне аддзелу наступае па камандзе: **«Стой!», «лягай!» або «хавайся!».**

На каманду **«стой!»** стральцы затрымліваюцца на месцы, дзе застала іх каманда. Стрэльбы бяруцца да нагі.

**«Хавайся».** Стральцы выбіраюць хутка закрытае перад наглядам і агнём ворага становішча. Пры гэтым сувязь у дружыне павінна быць захаванай. Калі час пазваляе, трэба акапацца.

**Зборкі.** На даны загад, дружына зьбіраецца ў рад, да збору зьвязу або роты; дружыны зьбіраюцца ў маршавую калёну і пад камандай дружыноваго даходзяць найкаротшай дарогай у месца зборкі.(Рыс. 3, 4 і 5).

## *IV ЧАСТКА*

## I. З Ь В Я З.

I. 1. Стралецкі зьвяз складаецца з камандзіра зьвязу, дружыны камандзіра (адзін падафіцэр і тры стральцы), чатырох дружын, дружыны гранатамётчыкаў (адзін унтэр-афіцэр і два стральцы) і двух двуколак.

2. Дружына камандзіра складаецца: з падафіцэра, як камандзіра дружыны, двух пасланцоў і трубача.

3. Камандзір дружыны камандзіра сочыць за полем бою і пра ўсё даносіць камандзіру зьвязу, высылае пасланцоў, прымае ўсе даклады і перадае камандзіру зьвязу. Ён-жа зьяўляецца заступнікам камандзіра зьвязу, калі апошні выбудзе.

II. 1) **Зборкі зьвязу.** Зьвяз мае злучныя строі: 3 шэрагі, маршавая калёна, рад. Для гэтых строяў аддаецца каманда: **а) «3 шэрагі—зборка!»; б) «маршавая калёна—зборка!»; в) «рад—зборка!».**

Перад адданьнем асноўнай каманды камандзір зьвязу камандуе: «Увага!». На гэтую каманду ўсе стральцы становяцца фронтам да камандзіра зьвязу у паставе «зважай». Камандзір становіцца там, дзе хоча зрабіць зборку, і аддае адну з трох камандаў.

2) На каманду **«Тры шэрагі—зборка!»** усе стральцы прысьпешаным крокам ідуць да месца зборкі і становяцца дружынамі. Камандзір трэцяй дружыны становіцца за 3 крокі перад камандзірам зьвязу, за ім дружыновыя дру-



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

гой і першай дружыны. Улева ад іх дружыны ў чарговай нумарацыі. За чацьвертай дружынай два пасланцы і трубач, побач цэляўнічы гранатніка, санітар і амуніцыйны гранатніка. У апошнім радзе камандзір дружыны камандзіра, дружыновы чацьвертай дружыны і камандзір гранатніка (рыс. 6). Калі тры шэрагі зробяць зварот управа, атрымаецца маршавая калёна.



*Зьвяз стралецкі ў тры шэрагі*

Рыс. 6.

3) Маршавую калёну прымаецца на каманду: **«Маршавая калёна—зборка!»**.

4) На каманду **«у рад—зборка!»** дружыны становяцца у рад адна за аднэй. Водступ аднэй дружыны ад другой—5 крокаў. Водступы паміж стральцамі у дружыне — 80 см.

## II. ПРЫКЛАДЫ КАМАНДАЎ

| ЗЬМЕНЫ ФОРМЫ | КАМАНДА | ВЫКАНАНЬНЕ |
|---|---|---|
| З тры шэрагу у маршавую калёну | „Управа фронт, аддзел (роўным крокам) — марш!" | На папярэджальную каманду (аддзел) камандзір зьвязу ідзе на свае месца (тры крокі перад галавой калёны). |
| | „Маршавая калёна управа. Свабодным крокам—марш!" | Камандзір дружыны на правым флангу ідзе проста перад сябе. Дружыновыя другой і першай дружыны заходзяць управа ад яго. Зьвяз робіць фронт управа і ставарае за трыма дружыновымі маршавую калёну. |
| **У руху**<br>**З маршавай калёны у тры шэрагі.** | „У тры шэрагі **улева**—марш!" | Камандзір дружыны левага раду ідзе перад сябе. Левы рад заходзіць улева. Сярэдні і правы рад заходзяць за ім, прыймаючы належны водступ і прамежак. |
| | Або<br>„Улева—фронт!" | Зьвяз робіць зварот улева. Камандзір зьвязу ідзе на свае месца. |



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

480

## III. КАЗЛАВАНЬНЕ ЗБРОІ.

Зброю казлуецца з трох стрэльбаў: з маршавай калёны (кожная тройка), з вучэбнай калёны і з тры шэрагу (кожны рад).

На каманду: **«У казлы!»** у маршавай і вучэбнай калёне правы рад робіць улева фронт. Сярэдні і левы рад—управа. Стральцы правага і сярэдняга раду правай рукой устаўляюць стрэльбы паміж стопаў. Дула накіраванае крыху ўлева.

На каманду **«зброю!»** стральцы левага раду перадаюць свае стрэльбы сярэдняму раду. Стрэльбы складаецца ў казлы па тры. Рады адступаюць крок ад зброі, робяць фронт у папярэднім напрамку і спачываюць. У тры шэрагу на каманду **«у казлы!»** першы і другі шэраг робяць зварот у тыл. На каманду **«зброю!»** паўтараецца дзейнасьць, як вышэй.

На каманду казлаваньня кулямёты ўстаўляюцца на зямлю, а цыклісты сходзяць са сваіх самакатаў (матацыкляў).

Для расказлаваньня зброі, калі аддзел у разыходзе, загадваецца: **«Увага!».** На каманду **«да зброі!»** стральцы ўстаўляюцца у строй, з якога казлавалася зброя. На каманду **«за!»** першы і другі шэраг (левы і сярэдні рад) робяць зварот у тыл (управа). На каманду **«зброю!»**—казлы разьбіраецца, як пры складаньні. Першы і другі шэраг (левы і сярэдні рад) робяць зварот у тыл (улева). Паложаны рыштунак і машыновую зброю падымаецца з зямлі. Цыклісты і коньнікі садзяцца на свае самакаты і коні.

## IV. СТРОЙ РАСКІДНЫ ЗЬВЯЗУ.

1. У полі ьарожага артылерыйскага абстрэлу, раскідаемся ў глыбіню або ў шырыню,—інакш кажучы—прыймаем строй раскідны. Каб лепш выкарыстаць поле і гэтым самым як найбольш зблізіцца да праціўніка, камандзір зьвязу ідзе перад сваімі людзьмі. Мясцовасьці, якія знаходзяцца пад агнём, у меру магчымасьці абмінаюцца. Калі не паданы кірунак маршу, зьвяз маршыруе за сваім камандзірам.

У загадзе для камандзіра зьвязу для раскіданьня аддзелу паміж іншым падаецца:

1. Весткі аб ворагу і ўласнае палажэньне.
2. Нашае заданьне.
3. Строй зьвязу (водступы і прамежкі).
4. Дарога, кірунак або азымут.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

2) **Формы строю.** У маршы зблiжаньня раскiдаем зьвяз у глыбiню, прыймаючы строй **«Дружына за дружынай»** (рыс. 7).

Гэты спосаб спрыяе лепшаму выкарыстаньню поля i дае магчымасьць хутка зблiжыцца да ворага. Строй «дружына за дружынай» у меру магчымасьцi захаваць як найдаўжэй.




Рыс. 7.

Калi не было асобнага загаду, то на каманду **«Дружына за дружынай раскiдным—марш!»** дружыны маршыруюць адна за аднэй у водступе 5-цi крокаў. Дружына камандзiра за зьвязовым. На канцы зьвязу абслуга гранатнiка.

У маршы ноччу, у тумане або ў лесе водступы зьмяншаюцца. Пры ўваходзе ў поле бою зьвяз раскiдаецца ў шырыню. (Рыс. 8). У залежнасьцi ад поля i баявых абставiн зьвязовы высылае ўперад адну, дзьве або тры дружыны. Калi ня было асобнага загаду, водступы мiж дружынамi—100 мэтраў, прамежкi дружыны ад дружыны—50 мэтраў. Лёгкi гранатнiк—за апошняй дружынай. Дружына камандзiра—за сваiм зьвязовым.

Пры разгрупаваньнi ў шырыню, у залежнасьцi ад баявых i палявых умоваў, дружыновыя прыймаюць у сваiх дружынах адну з форм разлучнага строю.

## V. ПРЫКЛАДЫ КАМАНДАЎ:

**1. «Уздоўж углыбленьня, дружына за дружынай, раскiдным—марш!».**

**2. «Кiрунак блiжэйшае ўзвышша; трэцяя i другая дружыны ўперад; раскiдным, бегам—марш!».**

**3. «Кiрунак рог лесу. Тры дружыны уперад. Раскiдным—марш!».** (Рыс. 8).



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

481

## V ЧАСТКА

### I. РОТА.

1. Стралецкая рота складаецца з камандзіра роты, дружыны камандзіра роты, трох стралецкіх зьвязаў і абозу. Для роты прыдзеляецца часта зьвяз цкм або дружыну супроць панцырных гармат.




Рыс. 8.

2. Дружына камандзіра мае: а) фэльдфэбель (камандзір дружыны), б) тры пасланцы пешыя і адзін самакатчык, в) трубач, г) два самакатчыкі для лучнасьці ў роце, д) адзін падафіцэр санітарны, е) чатыры санітары.

3) Абоз мае: а) аднаго падафіцэра (камандзір абозу), б) падафіцэра жыўнасьці, в) па дафіцэра зброі, г) падафіцэра мундзіровага, д) двох майстроў зброі, е) двох шаўцоў, ж) двох краўцоў, з) палявую кухню з возам прыкухонным, і) воз фуражовы, к) воз майстэрскіх прыладаў, л) шэсьць вазоў амуніцыйных, м) адзін воз санітарны.

### II. ЗБОРКІ СТРАЛЕЦКАЕ РОТЫ.

**1) Строй злучны.** Тры шэрагі, вучэбная калёна і маршавая калёна.

2. Для гэтых строяў аддаецца каманда: **«Тры шэрагі—зборка!», «маршавая калёна—зборка!», «вучэбная калёна—зборка!».**

Перад адданьнем асноўнай каманды камандзір камандуе **«Увага».** На гэтую каманду ўсе стральцы становяцца фронтам да камандзіра роты ў асноўнай паставе. Камандзір становіцца там, дзе хоча зрабіць зборку, і падае адну з трох камандаў.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

3. На каманду «**Тры шэрагі—зборка**» усе стральцы ідуць прысьпешаным крокам да месца зборкі і становяцца зьвязамі адзін зьвяз побач другога ў чарговай нумарацыі. Камандзір першага зьвязу становіцца тры крокі перад камандзірам роты, побач першы зьвяз. Дзесяць крокаў за калёнай абоз роты. (Рыс. 9).




Рыс. 9.

4. Вучэбная калёна ўжываецца пры пераходзе праз горад або пры аддаваньні пашаны.

На каманду «**вучэбная калёна**» зьвязы становяцца адзін за другім у водступе двух крокаў. Камандзір роты чатыры крокі перад калёнай. Камандзіры зьвязаў з правага боку і побач сваіх дружыновых. Дружына камандзіра за 1-м зьвязам. На канцы калёны дружына супроцьпанц. гарм. Хвост калёны зачыняе камандзір абозу. (Рыс. 10).




Рыс. 10.

5. Маршавая калёна ўжываецца пры маршах за горадам. На каманду «**маршавая калёна**»—камандзіры першага і другога зьвязу маршыруюць на чало калёны і ўстаўляюцца побач камандзіра роты. Камандзір трэцяга зьвязу на канцы калёны. Водступы між зьвязамі 80 см.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

## III. ПРЫКЛАДЫ КАМАНДАЎ

| ЗЬМЕНЫ ФОРМЫ | КАМАНДА | ВЫКАНАНЬНЕ |
|---|---|---|
| З трышэрагу у вучэбную калёну | 1) „Управа фронт. Рота—марш!" | На папяраджальную каманду (рота) камандзіры зьвязаў ідуць на свае месцы. Водступы між стральцамі—80 см., між зьвязамі—2 крокі. |
| | 2) Вучэбная калёна управа, вольным (роўным) крокам—марш! | Камандзір дружыны на правым крыле ідзе проста перад сябе. Дружыновыя (яго заплечнікі) заходзяць управа ад яго, утвараючы першую тройку-рота робіць управа фронт і утварае за імі вучэбную калёну, як на рыс. 10. Камандзіры зьвязаў становяцца на сваіх мясцох. |
| З вучэбнай калёны у маршавую (у маршы). | 3) „Маршавая калёна!" | Камандзіры першага і другога зьвязаў становяцца абапал кам. роты. Зьвязовы трэцяга зьвязу на канцы калёны. Водступы між зьвязамі звужваюцца да 80 см. |
| З вучэбнай калёны у трышэраг (у маршы). | „У трышэраг улева марш!" | Першы дружыновы у левым радзе ідзе далей у тым самым напрамку. Левы рад выраўнаны; ідучы адзін побач другога, заходзяць улева ад яго, утвараючы шэраг. Другі і трэці рад, захоўваючы належныя водступы і прамежкі, заходзяць за першым шэрагам. |
| | Або улева—фронт | Пасьля звароту, кам. зьвязаў маршыруюць на свае месцы. Трымаюцца водступы і прамежкі, як у трышэрагу. |
| З трышэрагу у вучэбную або маршавую калёну **у маршы** | Вучэбная калёна (маршавая калёна) **управа** | Трэці дружыновы на правым флангу ідзе далей у тым самым напрамку. Другі і першы дружыновыя заходзяць управа ад яго, утвараючы першую тройку. Рота робіць управа фронт і утварае вучэбную (маршавую) калёну. Камандзіры зьвязаў ідуць на свае месцы. |



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

## IV. РАСКІДНЫ СТРОЙ РОТЫ.

1. Формы раскіднога строю, як у зьвязе. Каб цяжкая зброя не апазьняла руху, умяшчаем яе за апошнім зьвязам. Камандзір роты займае найвыгаднейшае для камандваньня становішча. Ён нясе адказнасьць за ўтрыманьне лучнасьці з суседнімі адзінкамі. Калі рота ня мае бакавых суседніх аддзелаў, флангі забясьпечваецца бочнымі аховамі. Пры наступе, вазы з амуніцыяй едуць за апошнім зьвязам. Пры маршы зблiжаньня зьвязы маршыруюць адзін за другім. Водступы паміж зьвязамі—10 крокаў. Для аховы і разьведаньня поля высылаецца часта адну дружыну ўперад. (Рыс. 11).

2. Пры ўваходзе ў поле бою, рота раскідаецца ў шырыню. Пры гэтым уперадзе можа быць два зьвязы або адзін. Прамежак між зьвязамі—150 мэтраў, водступ—150 мэтраў. У залежнасьці ад поля і баявых абставін водступы і прамежкі могуць быць пабольшаныя або зьменьшаныя. (Рыс. 12).

3. Пасьля загаду да строю раскіднога ў роце, зьвязовыя даюць загады для строю раскіднога ў сваіх зьвязах, камандзіры дружын загадваюць строй разлучны ў сваіх дружынах (рад стралецкі або шнур стралецкі). Выбар форм строю раскіднога для кожнага зьвязу і разлучнага для дружын астаецца у руках камандзіраў зьвязаў і дружын.



Рыс. 11.



Рыс. 12.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

483

## V. ПРЫКЛАДЫ КАМАНДАЎ.

Прыклады камандаў для хуткага прыняцьця строю раскіднога:

**1. «Уздоўж дарогі зьвяз за зьвязам раскідным—марш!»**

**2. «Кірунак дрэва, зьвяз за зьвязам. Першая дружына з другім цкм, як пярэдняя ахова, 300 мэтраў уперад. Раскідным—марш!».**

**3. «Кірунак бліжэйшае ўзвышша. 2 зьвязы ўперад—раскідным, бегам—марш!»**

**4. «Управа уздоўж дарогі. Адзін зьвяз уперад. Водступ 120 мэтраў, прамежак—100 мэтраў. Раскідным—марш!».**

**IV. ЗБОРКІ.** На загад або знак камандзіра, дружыны ў маршавых калёнах даходзяць на вызначанае месца.

---



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

483 об

# ПАЯСЬНЕНЬНІ ЗНАКАЎ



камандзір роты

камандзір зьвязу

кам. дружыны камандзіра зьвязу

камандзір дружыны

кам. дружыны камандзіра роты

цэляўнічы к.м.

амуніцыйны

стралец

заст. камандзіра дружыны

пасланец

трубач

кам. дружыны гранатамётчыкаў

цэляўнічы гранатаметчыка

кам. п-панц гарматы

стралец п.-панц гарматы

санітарны падафіцэр /на самакаце/

самакатчык

камандзір абозу



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

484

# КЛЮЧ ВАЖНЕЙШЫХ ПАЛЯВЫХ ЗНАКАЎ.

| | ЗНАК | ЗНАЧЭНЬНЕ |
|---|---|---|
| 1 | Падняць руку уверх | а) „Увага!“ — папераджальны знак)<br>б) „Зразумела!“ або „Гатоў!“ |
| 2 | Махаць высока паднятай рукой (Насьлядоўваючы сьціраньне дошкі)<br>а) у маршавай калёне<br>б) у маршы „на вольна“<br>в) як адказ на паданы знак | <br><br>а) „Вольна!“<br>б) „Маршавая калёна!“<br>в) „Незразумела!“ |
| 3 | Высока паднятую руку хутка апусьціць уніз<br>а) у руху<br>б) на месцы | <br>а) „Стой!“<br>б) „З коней!“ (з вазоў) |
| 4 | Паднятыя уверх рукі апусьціць на вышыню грудзей і падняць іх зноў хутка уверх. | а) Падручныя коні уперад!<br>б) абоз уперад! |
| 5 | Кулак з грудзей высунуць хутка убок на даўжыню выцягненай рукі.<br>Дзейнасьць тройчы паўтарыць. | „З дарогі!“<br><br>„Лятун—хавайся!“ |
| 6 | Паднятай уверх рукой зазначаць кола. | „Раскідным (або разлучным)—марш!“ |
| 7 | Высунутай убок рукой зазначаць кола. | „Зборка!“ |
| 8 | Рукі скрыжаваць на грудзях | „Зброю у казлы“. |
| 9 | Падымаць і апушчаць выцягненую руку, вызначаючы роўнядзь простападлую да корпусу. Далонь скіраваная уніз. | „Лягай.“ |
| 10 | Выкінуць адначасна абедзьві рукі убок. | „На становішча!“ |
| 11 | Шапку падняць уверх | „Мы тут!“ |



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

| | ЗНАК | ЗНАЧЭНЬНЕ |
|---|---|---|
| 12 | Стрэльбу падняць уверх (у вэртыкальнае палажэньне). | „Поля можна прайсьці!" |
| 13 | Стрэльбу трымаць над галавой у гарызантальным палажэньні. | „У мясцовасьці праціўнік"! або „Нельга прайсьці!" |
| 14 | Падняць уверх лапатку. | „Мы акопваемся!" або „Акапацца!" |
| 15 | Падняць амуніцыйную скрынку. | „Амуніцыя уперад!" |
| 16 | Падняць уверх супроцьгазавую маску | „Газ!" |
| 17 | Паднятую уверх руку апусьціць вэртыкальна на вышыню вачэй, згінаючы яе у локці. Дзейнасьць паўтарыць. | а) На месцы — „садзіцца на коні" (на вазы) б) у руху — „Хутчэй!" (бягом). |
| 18 | Высока паднятую руку паволі апусьціць бокам уніз. | „Памалей!" |

ЗАЎВАГА. Перад паданьнем кожнага загаду падаць знак „Увага" Прыймаючы загады павінен адказаць гэтакім-жа знакам, пасьля чаго можна падаваць далейшыя каманды.



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь

485

# ЗЬМЕСТ.


Уводны загад . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**I ЧАСТКА**

Агульныя азначэньні . . . . . . . . . . 7

**II ЧАСТКА**

Адзіночная падрыхтоўка . . . . . . . . . 8
Асноўная пастава . . . . . . . . . . . 8
Ухваты . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Марш . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Звароты на месцы . . . . . . . . . . . 10
Звароты ў маршы . . . . . . . . . . . 11
Набіваньне і забясьпечаньне. Выбіваньне . . . . . . 12
Настаўленьне цэльніка . . . . . . . . . 13
Насаджваньне і зьніманьне штыха . . . . . 13
Аддаваньне пашаны . . . . . . . . . . 13

**III ЧАСТКА**

Дружына . . . . . . . . . . . . . . . 14
Зборкі дружыны . . . . . . . . . . . . 15
Марш, бег, зьмены напрамку . . . . . . . 16
Прыклады камандаў . . . . . . . . . . 16
Строй разлучны дружыны . . . . . . . . 17
Прыклады камандаў . . . . . . . . . . 18

**IV ЧАСТКА**

Зьвяз . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Казлаваньне зброі . . . . . . . . . . . 21
Строй раскідны зьвязу . . . . . . . . . 21
Прыклады камандаў . . . . . . . . . . 22

**V ЧАСТКА**

Рота . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Зборкі стралецкае роты . . . . . . . . . 23
Прыклады камандаў . . . . . . . . . . 25
Раскідны строй роты . . . . . . . . . . 26
Прыклады камандаў . . . . . . . . . . 27
Паясьненьні знакаў . . . . . . . . . . 28
Ключ важнейшых палявых знакаў . . . . . 29


---



Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь